✓З **10 студзеня** ў Нацыянальнай бібліятэцы Беларусі працуе выстава **«Жамчужыны беларускай прыроды»**, прымеркаваная да Сусветнага дня запаведнікаў і нацыянальных паркаў.

Штогод 11 студзеня адзначаецца Сусветны дзень запаведнікаў і нацыянальных паркаў. Гэтае свята актуалізуе праблему ахоўных прыродных тэрыторый, што дае магчымасць зберагчы ад гібелі частку дзікай прыроды і жывёльнага свету.

Міжнароднай формай ахоўных тэрыторый з'яўляюцца біясферныя запаведнікі. У Беларусі першы запаведнік, Бярэзінскі, быў створаны ў 1925 г. для захавання баброў. Сёння ён уваходзіць у сусветную сетку біясферных запаведнікаў ЮНЕСКА. У нашай краіне існуюць 4 нацыянальныя паркі, 2 запаведнікі і 527 заказнікаў рэспубліканскага і мясцовага значэння.

Нацыянальны парк «Белавежская пушча» – адна з найстаражытнейшых славутасцей Рэспублікі Беларусь і адзін з самых тытулаваных паркаў ва ўсім свеце. У 1992 г. ён быў уключаны ў спіс аб'ектаў Сусветнай спадчыны ЮНЕСКА.

Экспазіцыя складаецца з 9-і тэматычных раздзелаў: «Прыродныя тэрыторыі Беларусі пад аховай»; «Нацыянальныя паркі Беларусі. Белавежская пушча», «Нацыянальныя паркі Беларусі. Браслаўскія азёры», «Нацыянальныя паркі Беларусі. Нарачанскі», «Нацыянальныя паркі Беларусі. Прыпяцкі», «Па запаведных месцах. Бярэзінскі біясферны запаведнік», «Па запаведных месцах. Палескі дзяржаўны радыяцыйна-экалагічны запаведнік», «Заказнікі Беларусі», «Запрашаем у Беларусь».

На выставе прадстаўлены сапраўдны рарытэт – трэці том выдання «Живописная Россия», які выйшаў у 1882 г. Ён складаецца з дзвюх частак, адна з якіх мае назву «Белорусское Полесье». Тут змешчаны артыкулы, напісаныя гісторыкам і этнографам Адамам Кіркорам на падставе матэрыялаў, сабраных ім у экспедыцыях 1840 –1850-х гг. У нарысе «Природа Белоруссии» распавядаецца пра ўзгоркі і ўзвышшы, Нёманскі, Дняпроўскі і Заходне-Дзвінскі басейны, азёры, балоты, таксама пра звяроў і птушак. Нарыс ілюстраваны малюнкамі У. Дмахоўскага і М. Каразіна.

Да ліку ўнікальных экспанатаў на выставе варта аднесці выданне «Беловежская пуща» (1894), якое мае арыгінальны падзагаловак «Наброски пером и фотографией». Яно ўключае артыкул пра Белавежскую пушчу і 40 фотаздымкаў Я. Вішнякова




з маляўнічымі відамі самага старажытнага запаведніка Еўропы. У гэтым шэрагу – выданне «Белавежская Пуща: её исторический очерк, современное охотничье хозяйство и Высочайшие охоты в Пуще» (1903), багата ілюстраванае мастакамі М. Зічы, К. Крыжыцкім, В. Навозавым, таксама фотаздымкамі А. Далматава, Г. Карцава і інш. Галоўная ўвага аўтарам звернута на апісанне буйнейшага прадстаўніка белавежскай фаўны – зубра і яго жыццё ў пушчы.

У экспазіцыі таксама прадстаўлены манаграфія «Белавежская пушча: вытокі запаведнасці, гісторыя і сучаснасць», падрыхтаваная Інстытутам гісторыі Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі; энцыклапедыя «Прырода Беларусі» ў трох тамах; навукова-папулярныя выданні; фотаальбомы з работамі вядомых беларускіх фотамастакоў С. Плыткевіча, А. Дрыбаса, А. Клешчука, І. Бышнёва; ілюстраваныя даведнікі; турыстычныя буклеты.

Выстава працуе да 5 чэрвеня.